Search

Вясна / Правы чалавека ў Беларусі
@viasna96
11.9K subscribers
13.6K photos
331 videos
15 files
13K links
Тэлеграм-канал Праваабарончага цэнтру «Вясна». Актуальныя навіны ў галіне правоў чалавека ў Беларусі.

Пра затрыманні пісаць на @viasna_bot, для кансультацый - @ViasnaSOS.
Сувязь з інфармацыйнай службай: @Viasnainfo
Юрыдычная служба: @zvarot96

Download Telegram

About

Blog

Apps

Platform

Join

Вясна / Правы чалавека ў Беларусі
11.9K subscribers

Вясна / Правы чалавека ў Беларусі

Мінчука асудзілі да пяці гадоў калоніі ўзмоцненага рэжыму паводле трох артыкулаў

30 верасня ў судзе Ленінскага раёна Мінска вынеслі прысуд 40-гадоваму **Андрэю Навіцкаму**. Яго прызналі вінаватым паводле адразу трох артыкулаў Крымінальнага кодэкса — **арт.368, арт.295 і арт.342** і прысудзілі пяць гадоў пазбаўлення волі ў калоніі ўзмоцненага рэжыму. Яго абвінавачвалі ва ўдзеле ў трох восеньскіх акцыях мінулага году, абразе Лукашэнкі ў YouTube і незаконным захоўванні пораху.

Калі Навіцкага запыталі, чаму, нягледзячы на тое, што яго прыцягвалі да адміністрацыйнай адказнасці, ён не спыніў хадзіць на несанкцыянаваныя масавыя мерапрыемствы, ён адказаў: ***«Праз тое, што свядома адмаўляюць у правядзенні шэсцяў, права на якія ў грамадзян ёсць па Канстытуцыі!»***

Падрабязнасці 👉 **bit.ly/3F3iCI5**
5.0K views14:18
September 30, 2021



Вясна / Правы чалавека ў Беларусі

Палітвязню Кірылу Чарткову прысудзілі тры гады «хіміі»

Вынесены прысуд па крымінальнай справе палітвязня **Кірыла Чартков**, якога вінавацілі ў арганізацыі або актыўным ўдзеле у групавых дзеяннях, што груба парушаюць грамадскі парадак (арт. 342 КК РБ) — *«11 жніўня 2020 далучыўся да неўстаноўленых асоб, выкрыкваў лозунгі і гучна пляскаў далонямі, каля дому №37 на вуліцы Кальварыйскай перагарадзіў рух транспарту».*

Суддзя **Юлія Шут** прысудзіла Кірылу абмежаваннем волі з накіраваннем ва ўстанову адкрытага тыпу тэрмінам на тры гады. Таксама яна пастанавіла разгледзець у межах грамадзянскай судавытворчасці матэрыяльны пазоў прадпрыемства «Мінсктранс» у памеры **21 тысяча 667 рублёў**.

Падрабязнасці bit.ly/3mfJJqM
5.0K views14:36
September 30, 2021

Вясна / Правы чалавека ў Беларусі

На трое сутак затрымалі гомельскага актывіста Іллю Міронава

Пра гэта ў сябе на старонцы ў Facebook паведаміла яго маці Валянціна.

«Больш нічога не вядома. Можа хто быў сведкам затрымання — адгукніцеся»

Аператыўна паведаміць пра затрыманне ці вобшук можна ў нашым тэлеграм-боце @viasna_bot

🔷*Паведаміць пра затрыманне, а таксама атрымаць бясплатнае юрыдычнае кансультаванне* 👉 *@ViasnaSOS, @SosViasna*
4.8K viewsedited 14:53
September 30, 2021

Вясна / Правы чалавека ў Беларусі
Forwarded from Вясна: Палітвязні Беларусі

❗**Палітвязень Мікіта Емяльянаў распавёў сваякам па тэлефоне, што ў ШІЗА яго ўтрымлівалі 42 дні**

Больш за месяц ад палітзняволенага **Мікіты Емяльянава** не было ніякіх звестак: ні тэлефанаванняў, ні лістоў да блізкіх і сяброў. У сярэдзіне верасня да палітвязня трапіў адвакат і даведаўся, што Мікіту больш за месяц утрымлівалі ў ШІЗА. Пасля 37 сутак хлопец павінен быў выйсці з ізалятара 17 верасня.

Сёння Емельянаў патэлефанаваў родным з турмы і паведаміў, што адбыў у ШІЗА **42 дні**, а выйшаў толькі 22 верасня. Вядома, што адміністрацыя турмы склала на палітвязня **шэсць** рапартаў за парушэнне правілаў унутранага распарадку

За гэты час Мікіце прыйшло 40 лістоў, на якія ён ўжо напісаў адказы. Акрамя гэтага, ён падцвердзіў, што яго **пазбавілі кароткатэрміновага спаткання з роднымі**, якое на строгім турэмным рэжыме прадугледжанае раз на год. Не вядома, ці дамогся Емяльянаў адзіночнага ўтрымання.

📩**Падтрымайце палітвязня паштоўкамі і лістамі салідарнасці:** Турма №4, 212011, г. Магілёў, вул. Крупскай, 99А
4.9K views15:36
September 30, 2021

Вясна / Правы чалавека ў Беларусі

❗**У Беларусі +12 новых палітвязняў.**

Гэта **Ігар Адаменкаў, Вадзім Ермаловіч, Андрэй Ізотаў, Яўген Кіслейка, Вадзім Ермашук, Ігар Пятран, Мікалай Слёз, Мікіта Прысталенка, Віталь Жук, Сяргей Банькоў, Вячаслаў Савічаў** і **Дзяніс Сяргееў.**

Хто гэтыя людзі і чаму праваабарончыя арганізацыі лічаць іх справы палітычна матываванымі 👉 bit.ly/3D15Bx2

Спіс усіх палітвязняў Беларусі 👉 bit.ly/306kkW9
5.4K views15:49
September 30, 2021

Вясна / Правы чалавека ў Беларусі
Вясна / Правы чалавека ў Беларусі
⚡Барда і пісьменніка Анатоля Кудласевіча аштрафавалі на 2900 рублёў за БЧБ-сцяг на акне Сёння ў судзе Фрунзенскага раёна разглядзелі справу барда і пісьменніка Анатоля Кудласевіча. Судовы працэс вяла суддзя Ала Скуратовіч. Пратакол на Анатоля склалі па…
«ГУБАЗ казаў: вы зомбі бчбшныя, хочаце крыві». Анатоль Кудласевіч распавёў як грамілі яго кватэру:

«Грукаюць у дзверы: адкрывайце, міліцыя! Я адкрыў, крычаць: «На падлогу!», **залятаюць у экіпіроўцы, у бронекамізэльках чатыры чалавекі з ГУБАЗіКа.** Я лёг на падлогу, пачалі свяціць у вочы, рукі за спіну і накінулі кайданкі. **Каву павысыпалі, муку, крупу, цукар, кніжкі з паліц паскідвалі,** нават не праглядалі іх. Проста **рылі ўсё, зрывалі, ламалі**».

«Гітару разбілі: убачылі на ёй бела-чырвона-белы матузок і з крыкам **«Гэта бчбшная гітара!» — бах! бах! яе**». Я нават сказаў: ты што робіш, гітара старэйшая за цябе, сумлення ў вас няма! То мяне **адзін раз нават ударылі далонню**».

«Сцяжок на лоджыі ў мяне ляжаў, яны **запхалі мне яго за каўнер і фатаграфуюць мяне**. Знайшлі сіні дынамаўскі шалік, на ім таксама Пагоня, дык яго мне на шыю накінулі і таксама фатаграфавалі».

«Пасля мяне павезлі ў будынак ГУБАЗіК на Рэвалюцыйнай. Пагаварылі там са мною, пераконвалі: **вы, бэчэбэшнікі, зомбі ўсе, хочаце рэвалюцыі, крыві, вайны…** А я свае аргументы ім».

Крыніца: @nashaniva
5.7K views16:32
September 30, 2021

Вясна / Правы чалавека ў Беларусі

❗**Па дадзеных на 18:00 «Вясне» вядомыя прозвішчы 44 затрыманых 29-30 верасня ў Беларусі.**

Большасць затрыманняў звязаная з каментаваннем у сацсетках пастоў пра гібель Андрэя Зельцэра і супрацоўніка КДБ — СМІ паведамлялі, што ў межах арт. 369 (абраза прадстаўніка ўлады) і арт. 130 (распальванне сацыяльнай варожасці) Крымінальнага кодэкса супрацоўнікі КДБ **затрымалі каля 50 чалавек.**

Хроніка палітычнага пераследу 30 верасня 👉 **bit.ly/3CRk12G**

🔹*Аператыўна паведаміць пра затрыманне ці вобшук можна ў нашым тэлеграм-боце* 👉 *@viasna_bot*

🔹*Паведаміць пра затрыманне, а таксама атрымаць бясплатнае юрыдычнае кансультаванне* 👉 *@ViasnaSOS*, *@SosViasna*
8.0K viewsedited 17:04
September 30, 2021

Вясна / Правы чалавека ў Беларусі
У Глыбокім міліцыянты расследуюць справу леташніх надпісаў на сценах

З гэтай нагоды сёння яны прыйшлі з пратрусам да жыхара Глыбокага **Руслана Рагоўскага**. Сілавікоў цікавілі рэчы, з дапамогай якіх былі зробленыя надпісы на сценах дамоў на вуліцы Паўночнай і на будынку глыбоцкага ліцэя.

Вобшук праводзіў кіраўнік крымінальнага вышуку Глыбоцкага РАУС маёр **Васіль Арлоў** з двума маладымі супрацоўнікамі.

*Крыніца: Б**сат*
5.0K views17:45
September 30, 2021

Вясна / Правы чалавека ў Беларусі
Forwarded from Вясна: Палітвязні Беларусі

❗**Палітвязня Івана Вярбіцкага, асуджанага да 8 гадоў і 1 месяца калоніі, збіраюцца пераводзіць на строгі рэжым**

56-гадовы **Іван Вярбіцкі** — мастак з Гальшанаў, мае дзве вышэйшыя адукацыі. Палітвязня абвінавацілі адразу па некалькіх сур'ёзных артыкулах: падбухторванне да акта тэрарызму, незаконныя набыццё, захоўванне боепрыпасаў і выбуховых рэчываў, а таксама знішчэнне афіцыйных дакументаў. 15 сакавіка Івана Вярбіцкага асудзілі да **8 гадоў і 1 месяца калоніі ўзмоцненага рэжыму.**

📣Вядома, што ў папраўчай калоніі на зняволенага гальшанца аказваўся ціск: два месяцы Івана ўтрымлівалі ў ШІЗА і ПКТ, з якога яго павінны былі выпусціць 5 кастрычніка. Сёння стала вядома, што палітвязня этапавалі ў магілёўскую турму №4, бо **збіраюцца змяніць рэжым з узмоцненага на строгі праз шматлікія «парушэнні».**

📩**Іван у адказ на лісты салідарнасці дасылае свае малюнкі. Падтрымаць яго:** Турма №4, 212011, г. Магілёў, вул. Крупскай, 99А,
Вярбіцкаму Івану Францавічу
5.5K views18:06
September 30, 2021

Вясна / Правы чалавека ў Беларусі

Парламенцкая Асамблея Рады Еўропы прыняла тэрміновую рэзалюцыю аб стварэнні «пастаяннага органа па сітуацыі з правамі чалавека ў Беларусі».

58 галасоў за, 15 — супраць, піша @viacorka
6.2K viewsedited 18:10
September 30, 2021



Вясна / Правы чалавека ў Беларусі

❗**Па дадзеных на 20:15 «Вясне» вядомыя прозвішчы 51 затрыманага 29-30 верасня ў Беларусі.**

Большасць затрыманняў звязаная з каментаваннем у сацсетках пастоў пра гібель Андрэя Зельцэра і супрацоўніка КДБ — СМІ паведамлялі, што ў межах арт. 369 (абраза прадстаўніка ўлады) і арт. 130 (распальванне сацыяльнай варожасці) Крымінальнага кодэкса супрацоўнікі КДБ **затрымалі каля 50 чалавек.**

Хроніка палітычнага пераследу 30 верасня 👉 **bit.ly/3CRk12G**

🔹*Аператыўна паведаміць пра затрыманне ці вобшук можна ў нашым тэлеграм-боце* 👉 *@viasna_bot*

🔹*Паведаміць пра затрыманне, а таксама атрымаць бясплатнае юрыдычнае кансультаванне* 👉 *@ViasnaSOS*, *@SosViasna*
8.2K viewsedited 19:17
September 30, 2021

Вясна / Правы чалавека ў Беларусі
Telegram-канал і YouTube-канал «Усы Лукашенко» прызнаныя экстрэмісцкімі.

Такое рашэнне 20 верасня прыняў суд Маскоўскага раёна горада Мінска.
5.4K views07:52
October 1, 2021

Вясна / Правы чалавека ў Беларусі
Forwarded from "Вясна" назірае

❗**У Наваполацку слесара «Паліміра» арыштавалі на 30 сутак за пікетаванне**

Слесара «Паліміра» і члена стачкі «Нафтана» **Дзмітрыя Саюнава** затрымалі ўвечары 28 верасня. Дома ў яго правялі ператрус і затрымалі. На яго склалі пратакол па **ч. 3 арт. 24.23 КаАП** за «несанкцыянаванае пікетаванне», але сутнасць абвінавачванняў пакуль невядомая.

⚖️Учора ў судзе Наваполацка Дзмітрыю прызначылі **30 сутак арышту**.
5.2K views08:09
October 1, 2021



Вясна / Правы чалавека ў Беларусі
Быў затрыманы яшчэ адзін афіцэр, які летась асудзіў міліцэйскі гвалт

29 верасня ў Століне быў затрыманы **Аляксандр Велясніцкі** — папярэдне, па справе каментароў у сацсетках пра гібель Андрэя Зельцэра і супрацоўніка КДБ. Паведамляецца, што па месцы пражывання мужчыны правялі ператрус, а яго самога перавезлі ў Мінск.

У жніўні мінулага года Аляксандр — былы афіцэр-памежнік — адмовіўся **ад медаля «За бездакорную службу»:**

— Я прыняў гэтую ўзнагароду з гонарам. Больш чым 15 гадоў сапраўды годнай службы ў памежных войсках і органах памежнай службы давалі падставу лічыць, што я маю права насіць гэтую ўзнагароду на сваім парадным кіцелі. Так было да ўчорашняга дня. ***Учора я даведаўся, што гэтым жа медалём у тэрміновым парадку ўзнагароджваюць тых, хто ўдзельнічае ў выкраданнях, збіваннях і катаваннях мірных людзей, жанчын і мужчын, непаўналетніх і падлеткаў, старых.***

Хроніка палітычнага пераследу 30 верасня 👉 **bit.ly/3CRk12G**
YouTube
Офицер пограничник отказался от медали "За безупречную службу"
Бывший офицер-пограничник отказался от медали «За безупречную службу»...

«Оказывается, безупречно служит тот, кто заливает кровью асфальт», - отметил бывший пограничник в обращении.

Своё решение житель города Столина Александр Велесницкий объяснил в видеобращении…
7.9K views08:29
October 1, 2021



Вясна / Правы чалавека ў Беларусі

Год таму Алесь Бяляцкі і «Вясна» былі ўганараваныя прэстыжнай міжнароднай прэміяй «За годны лад жыцця-2020»

1 кастрычніка 2020 года шведскі фонд «Right Livelihood Award Foundation» назваў лаўрэатаў прэміі «За годны лад жыцця-2020». Сярод чатырох лаўрэатаў — беларускі праваабаронца, старшыня «Вясны» **Алесь Бяляцкі**. Гэта вядомая міжнародная ўзнагарода, якую яшчэ называюць альтэрнатыўнай нобелеўскай прэміяй. **Ёй упершыню быў уганараваны грамадзянін Беларусі.**

Каментуючы ўручэнне міжнароднай прэміі **Алесь** сказаў:

— Прэмія, якой мяне ўганаравалі ў гэты драматычны для гісторыі Беларусі момант, з'яўляецца важнай падтрымкай для ўсяго беларускага грамадства, якое сёння хоча дэмакратычных зменаў, якое дабіваецца, каб правы чалавека ў Беларусі шанаваліся і выконваліся.

Алесь Бяляцкі быў затрыманы 14 ліпеня 2021 і з гэтага часу знаходзіцца ў зняволенні. Акрамя яго за кратамі знаходзяцца яшчэ шэсць «вясноўцаў» — **Валянцін Стэфановіч, Уладзімір Лабковіч, Марфа Рабкова, Андрэй Чапюк, Леанід Судаленка** і **Таццяна Ласіца.**
5.1K viewsedited 09:01
October 1, 2021

Вясна / Правы чалавека ў Беларусі
❗У Бабруйску зноў ператрусы

Раніцай 1 кастрычніка ў Бабруйску сілавікі прыйшлі з ператрусам да мясцовай актывісткі і кіраўніцы бабруйскай філіі прафсаюзу РЭП **Галіны Смірновай**. Пасля ператрусу яе затрымалі, але ў межах якой справы і ў якім статусе пакуль невядома.

Верагодна, ператрусы праходзяць і ў яшчэ некалькіх бабруйчанінаў — яны не выходзяць на сувязь.

🔷*Аператыўна паведаміць пра затрыманне ці вобшук можна ў нашым тэлеграм-боце* 👉 *@viasna_bot*

🔷*Паведаміць пра затрыманне, а таксама атрымаць бясплатнае юрыдычнае кансультаванне* 👉 *@ViasnaSOS, @SosViasna*
4.9K views09:06
October 1, 2021

Вясна / Правы чалавека ў Беларусі
Forwarded from "Вясна" назірае
❗Мінчанку адправілі на “суткі“ за дваравы Марш у Каменнай Горцы

Увечары 29 верасня ў мінскай Каменнай Горцы прайшоў дваравы Марш, падчас якога затрымалі **33-гадовую Вікторыю Сароку.** У Фрунзенскім РУУСе на дзяўчыну склалі пратакол за «ўдзел у несакцыянаваным шэсці з БЧБ-сцягамі і лозунгам “Жыве Беларусь“ (арт. 24.23 КаАП). Справу Вікторыі 30 верасня разглядзела суддзя Фррунзенскага раёна **Таццяна Полулех.**

Мінчанка на судзе адмовілася даваць паказанні і пацвердзіла, што прыняла ўдзел у Маршы. Міліцыянт на судзе сцвярджаў, што ім паступіла іфармацыя пра несанкцыянаванае масавае мерапрыемства па вуліцы Калеснікава. Калі яны з калегамі прыехалі на месца «правапарушэння», то ўдзельнікі пачалі адразу ўцякаць, а засталася толькі Вікторыя — яе і затрымалі. Міліцыянт таксама дадаў, што ў яе быў *«прыгожы плакат з сэрцам, кулаком і знакам Віктары»*. Але, па словах Вікторыі, міліцыянт, які яе затрымаў, выходзіў з пад’езда дома.

🚨Акрамя гэтага, Сарока паспела сказаць, што зараз на Акрэсціна знаходзяцца 188 чалавек, а саму яе змясцілі ў двухмесную камеру, дзе акрамя яе сядзяць яшчэ шэсць жанчын. У выніку, суддзя **Полулех** прызнала Вікторыю вінаватай і пакарала яе **13-сутачным** арыштам.
4.7K views09:16
October 1, 2021



Вясна / Правы чалавека ў Беларусі



0:33
This media is not supported in your browser
VIEW IN TELEGRAM
Жонка палітвязня Паўла Севярынца просіць «*дапамагчы ўсімі магчымымі спосабамі*», каб мужа адпусцілі на пахаванне бацькі

Сёння ўначы **Кастусь Севярынец** памёр ад COVID-19. Яму было 69 гадоў. Пахаванне адбудзецца ў роднай вёсцы Кастуся — Унорыцы Гомельскай вобласці.

4.7K viewsedited 09:28
October 1, 2021



Вясна / Правы чалавека ў Беларусі

«Быў вельмі ўзрушаны збіццём пратэстоўцаў, таму на эмоцыях пісаў гэтыя каментары». У Гомелі пачаўся суд над палітвязнем

30 верасня пачаўся суд над палітзняволеным гамельчуком **Яўгенам Маркаўцом** — яго затрымалі 28 траўня і ўжо чатыры месяцы ўтрымліваюць за кратамі за шэсць каментароў у тэлеграм-каналах. Гамельчука абвінавачваюць адразу па двух артыкулах Крымінальнага кодэксу: ч.1 арт. 342 (арганізацыя дзеянняў, якія груба парушаюць грамадскі парадак) і арт. 369 (публічная абраза прадстаўніка ўлады).

Па версіі абвінавачання, у жніўні і верасні мінулага года Маркавец у тэлеграм чатах размясціў «заклікі да супрацьпраўных дзеянняў», а таксама «пакінуў абразлівы каментар у адносінах да супрацоўніка АМАПа Варушчанкі». **Пацярпелы супрацоўнік АМАПу даведаўся пра абразу толькі ад следчага, які вёў справу супраць Маркаўца.**

Падрабязнасці **bit.ly/3omlj1s**
5.1K views09:35
October 1, 2021



Вясна / Правы чалавека ў Беларусі
Пятрусы ў непаўналетніх на Брэстчыне з-за надпісу на прыпынку

Як паведамляе @viasna_brest, днямі прайшлі пятрусы ў васьмі дамах у вёсцы Кавердзякі з-за надпісу «Жыве Беларусь» на прыпынку, пакінутым у ноч з 22 на 23 верасня. Шэраг грамадзян, пераважна непаўналетніх, падвергліся допытам — падзея надзвычайная для маленькай вёскі. Супрацоўнікі органаў прасілі згоду бацькоў на допыт без іх удзелу, даючы на роздум літаральна дзесяць хвілін.

Хроніка палітычнага пераследу 1 кастрычніка **bit.ly/3uvpPMj**

Аператыўна паведаміць пра затрыманне ці вобшук можна ў нашым тэлеграм-боце @viasna_bot

Паведаміць пра затрыманне, а таксама атрымаць бясплатнае юрыдычнае кансультаванне @ViasnaSOS, @SosViasna
5.6K views09:40
October 1, 2021



Вясна / Правы чалавека ў Беларусі

Па дадзеных на 11:00 «Вясне» вядомыя прозвішчы 84 затрыманых 29-30 верасня ў Беларусі.

Большасць затрыманняў звязаная з каментаваннем у сацсетках пастоў пра гібель Андрэя Зельцэра і супрацоўніка КДБ — СМІ паведамлялі, што ў

межах арт. 369 (абраза прадстаўніка ўлады) і арт. 130 (распальванне сацыяльнай варожасці) Крымінальнага кодэкса супрацоўнікі КДБ **затрымлівалі дзясяткі людзей па ўсёй краіне.**

Хроніка палітычнага пераследу 30 верасня **bit.ly/3CRk12G**

Аператыўна паведаміць пра затрыманне ці вобшук можна ў нашым тэлеграм-боце *@viasna_bot*

Паведаміць пра затрыманне, а таксама атрымаць бясплатнае юрыдычнае кансультаванне *@ViasnaSOS*, *@SosViasna*
7.0K views10:00
October 1, 2021